# Сею я лён ды па каменю




2. Высеян лён ды да зернятка,
Сонца нізка, вечар блізка.
Конь піць хоча,
Распрагай, хлопча.

3. Павяду каня да крынічанькі,
Сама стаю, каня паю.
Конь воду смокча,
- Не чапай, хлопча.

4. Напасу каня ды на выгане,
Сама к гаю пасляшаю.
Конь землю топча,
Даганяй, хлопча.

5. Гаем ідзем ды бярозавым,
У гушчары птушак пары.
Цяцёрка квокча,
- Пацалуй, хлопча!